Падтрымай "Вясну" на PATREON

Два гады "хіміі" Пятру Анісімовічу за негатыўны каментар у адрас кобрынскага падпалкоўніка

25.01.2022 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, дыфамацыя



Пётр Анісімовіч. Фота: Гарадзенская праваабарона.

У судзе Гарадзенскага раёна 25 студзеня разглядалася крымінальная справа Пятра Анісімовіча, якога абвінавацілі ў абразе прадстаўніка ўлады па артыкуле 369 Крымінальнага кодэксу.

Справу разглядала суддзя **Жанна Сафарэвіч**, дзяржабвінавачанне падтрымлівала пракурорка **Іна Кунікава.**

У якасці пацярпелага выступаў на той момант намеснік начальніка Кобрынскага РАУС па ідэалагічнай рабоце і кадрах падпалкоўнік міліцыі **Віктар Турчыновіч.**

Па матэрыялах абвінавачання, 26 жніўня 2020 года, знаходзячыся на тэрыторыі Гродзенскага раёна, з выкарыстаннем мабільнага тэлефона Хуавей у сацыяльнай сетцы “Аднакласнікі” пад паведамленнем Андрэя Ломшы *"Вось яшчэ адна мярзота збівае людзей у ІЧУ Кобрына"* з фатаграфіяй пацярпелага і яго дадзенымі, пакінуў абразлівы каментар, які носіць негатыўны характар ненарматыўнай лексікі - "дзярмо".

Дарэчы, і вышэйзгаданы жыхар Баранавіч **Андрэй Ломша** таксама прыцягнуты да крымінальнай адказнасці за абразу камандзіра ўзвода **Лісіцы** і таго самага Віктара Турчыновіча.

Ад паслуг адваката Пётр Анісімовіч адмовіўся.

Пад час судовых спрэчак абвінавачаны сваю віну не прызнаў, заявіўшы, што пад гэтым пастом было многа негатыву і абразаў, а ён, з мэтай спынення гэтага негатыву, напісаў слова "дзярмо", прычым ён напісаў гэта ў адказ Андрэю Ломшу.

Ніякага намеру, каб абразіць не меў, фатаграфіі пацярпелага ён не бачыў, а проста пакінуў сваё паведамленне пад негатыўнымі каментарамі, каб спыніць іх далейшае напісанне.

На папярэднім следстве Анісімовіч спачатку казаў, што быў абураны дзеяннямі супрацоўнікаў міліцыі і магчыма з гэтай нагоды зрабіў паведамленне. А ўжо ў судзе растлумачыў, што ён пакінуў каментар не ў дачыненні да пацярпелага, а ў сувязі з сітуацыяй і абстаноўкай у “Аднакласніках”.

Пацярпелы Турчыновіч на суд не з'явіўся, прасіў разгледзець справу ў яго адсутнасць, заявіў матэрыяльны пазоў на суму 1 000 рублёў.

Анісімовіча раней судзілі ў тым жа судзе за выяву герба "Пагоня" на фасадзе ўласнага дома. Тады, 15 траўня 2021 года суддзя **Дзмітрый Грышын** пастанавіў пакараць Анісімовіча штрафам у памеры 100 базавых велічынь.

Пракурорка, улічваючы абцяжарваючыя абставіны і тое, што злачынства здзейсненае па матывах палітычнай і расавай варажнечы, запрасіла для Анісімовіча **два гады абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу.**

Арышт з маёмасці не здымаць да задавальнення матэрыяльнага пазову, пазоў задаволіць у межах разумнасці і справядлівасці.

Суд пастанавіў: прызнаць Анісімовіча вінаватым і пакараць **абмежаваннем волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на два гады**. Задаволіць маральны пазоў у памеры 1 000 рублёў.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

"Беларусі пахваліцца няма чым". У Вене прайшла кансультацыя пра мірныя пратэсты


Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




"Кніга ў зняволенні – гэта больш чым кніга": што чытаюць беларусы ў СІЗА і калоніях?

У палітвязня ў турме здарыўся інфаркт і інсульт. Яго адправілі ў калонію

"А ў чым мне прызнаваць віну?" Гісторыя палітвязня з чырвонай біркай

Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык



ГАЛОЎНАЕ

Распачынаецца суд над праваабаронцай Настай Лойкай. Працэс зрабілі закрытым дапоўнена



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 15 новых палітычных зняволеных

"Не ўстаў падчас гімна", "пікетаваў татуіроўкай", "выкрыкнуў лозунг "Слава Украіне": за што беларусаў судзілі ў траўні

Псіхолагі прэзентавалі даклад пра псіхатраўму беларускіх актывістаў (дакумент)

Затрыманне былой палітзняволенай і іншыя факты пераследу 13 чэрвеня (дапоўнена)

Актывісту незалежнага прафсаюза БНП на ААТ "Гродна Азот" прысудзілі чатыры гады калоніі

Беларусь: спыніць жорсткае абыходжанне з Марыяй Калеснікавай

Затрыманыя амаль усе супрацоўнікі тэлеканала "Ранак", а таксама ўдзельнікі батлейкі ў Стулах: хроніка пераследу 11-12 чэрвеня (дапоўнена)

Затрыманні музыкаў, ціск на палітвязняў: хроніка пераследу 9 чэрвеня


Для актывістаў Беларускага Незалежнага прафсаюза абвінавачанне запрасіла чатыры гады калоній


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre Memorial

Московская Хельсинкская Группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY